танне сацыяльнага і нацыянальнага складу вучнёўскага кантынгенту. Справа ў тым, што ў першыя гады існавання ВБГ, значная колькасць навучэнцаў паходзіла з сялянскіх сямей, а таксама складалася з прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці [14, арк. 5–6].

Успаміны былой вучаніцы ВБГ А. Катковіч, на жаль, не з'яўляюцца дастаткова падрабязнымі, так як аўтар апісала асабістыя ўражанні і суперажыванні падчас вучобы. Аднак з іх можна падкрэсліць цяжкасці іншагародніх навучэнцаў, якія былі вымушаныя самастойна ў літаральным сэнсе выжываць у цяжкіх эканамічных умовах. Напрыклад, сама А. Катковіч была на апякунстве беларускага дзеяча Э. Будзькі, які і дапамог ёй паступіць у ВБГ [7, с. 30]. Прыгэтым аўтары і рэдактары ўспамінаў пастараліся зафіксаваць кожную згаданую асобу кароткай біяграфічнай даведкай.

Такім чынам, у большай ступені разглядаемая катэгорыя крыніц прадстаўлена ўспамінамі былых вучняў беларускай гімназіі ў Вільні. Шмат даследчыкаў характарызуюць яе як вучэбна-метадычны цэнтр, доўгі час рыхтаваўшы прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Вялікая частка з іх ужо апрацавана і апублікавана, што палягчае магчымасць даследчыкам працаваць з гэтымі крыніцамі. З іх можна падкрэсліць шмат інфармацыі пра грамадска-палітычныя абставіны, умовы існавання і працы, характарыстыку супрацоўнікаў і навучэнцаў і г. д. Успаміны, як адзін са складнікаў комплексу эгадакументаў, у пары з іншымі відамі крыніц могуць стаць важнай базай для стварэння прасапаграфічных даследаванняў, якія набіраюць папулярнасць у сучаснай беларускай гістарыяграфіі.


1. Горны, А. С. Эга-дакументы як крыніцы па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі / А. С. Горны // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2020. – Т. 65, № 3. – С. 286–297.
2. Багдановіч, Я. На жыццёвым шляху: Успаміны / Я. Багдановіч. – Мінск : Маст. літаратура, 1992. – 144 с.
3. Бурсевіч, І. Віленская беларуская гімназія / І. Бурсевіч // Маладосць: штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс. – 2011. – № 4. – С. 136–141.
4. Бурсевіч, М. В. Уступаючы ў жыццё… / М. В. Бурсевіч // У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі / Інстытут гісторыі партыі ЦК КП Беларусі. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. – С. 133–141.
5. Галяк, Л. Успаміны. Кніга 1. [Электронны рэсурс] / Л. Галяк. – Рэжым доступа: https://knihi.com/Leanid_Halak/Uspaminy.html. – Дата доступа: 26.12.2022.
6. Галяк, Р. Настаўнікі Віленскай Беларускай гімназіі / Р. Галяк // Полацак. – 1993. – № 3. – С. 41–45.
7. Катковіч, А. Успаміны / А. Катковіч, В. Катковіч-Клентак. – Беласток : Беларускае Гістарычнае Таварыства, 1999. – 117 с.
8. Коўш, З. Віленская гімназія / З. Коўш // Беларуская мінуўшчына. 1995. – № 1. – С. 34–36.
9. Летапіс віленскай беларускай гімназіі 1919–1944 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/_memoirs/203/Летапіс_віленскай_беларускай_гімназіі_1919-1944.html. – Дата доступа: 25.12.2022.
10. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 3. – С. 50–52.
11. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 4. – С. 54–57.
12. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 5. – С. 49–51.
13. Тумаш, В. Віленская беларуская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 9. – С. 37–40.
14. ЦНБ НАНБ. АРКР. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 64.
15. ЦНБ НАНБ. АРКР. – Ф. 35. Воп. 1. Спр. 94.



**Бароўская В.М.**


## КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ УЗАЕМАДАЧЫНЕННЯЎ 1921–1939 ГГ.

Крыніцы даследавання можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп. У першую чаргу гэта матэрыялы расійскіх, польскіх і беларускіх архіваў, якія дазваляюць выявіць шматлікія матывы бакоў, а таксама невядомыя даследчыкам падзеі і рашэнні. Каштоўныя данныя, якія маюць ключавое значэнне для ўсталявання прычын рашэнняў, якія прымаліся савецкім кіраўніцтвам адносна беларускага пытання, утрымліваюць дакументы Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ), у прыватнасці фонд сакратарыята Народнага камісара замежных спраў (НКЗС) Г.В. Чычэрына (ф. 4/04), фонды рэферэнтур па Польшчы (ф. 122/0122) і Літве (ф. 151/0151), матэрыялы савецка-германскай, савецка-літоўскай і савецка-польскай мірнай канферэнцый, а таксама фонды членаў Калегіі НКЗС М. М. Літвінава, А. А. Іофе і Я. С. Ганецкага, М. М. Красцінскага. Прадстаўляе цікавасць перапіска Г. В. Чычэрына, П. Л. Войкава, членаў Калегіі НКЗС паміж сабой і іншымі дыпламатамі, запісы іх размоў, даклады, артыкулы і прамовы Г.В. Чычэрына па міжнародных пытаннях, інфармацыйныя агляды НКЗС, агляды замежнага друку, пераклады дыпламатычных дакументаў замежнага паходжання і інш. Навуковая значнасць гэтых матэрыялаў заключаецца ў разуменні асаблівасцей фарміравання і трансфармацыі знешнеэканамічных курсаў Польшчы, СССР, Германіі і заходнееўрапейскіх краін.

Матэрыялы па беларускім пытанні прадстаўлены значным масівам навуковых выкладак, дакладаў аб этнаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне, дыялектах і арэале іх распаўсюджвання, параўнальных табліц па перапісам насельніцтва, аналізу поглядаў розных навукоўцаў і палітычных груп па праблеме межаў рассялення беларусаў. Такія даклады складаліся ў тэрміновым фармаце ў 1917 г. да Брэсцкай канферэнцыі (ф. 413) і больш дэталёва ў 1920 г. для савецка-літоўскай канферэнцыі.

Гэтымі ж даннымі карысталіся і на савецка-польскіх пераагаворах. Акрамя таго, у звестках гэтых фондаў утрымліваецца дыпламатычная перапіска з прадстаўнікамі РСФСР у Літве і Беларусі, інструкцыі НКЗС савецкай дэлегацыі, перапіска з іншымі зацікаўленымі ведамствамі, у тым ліку і з беларускім савецкім кіраўніцтвам.

З матэрыялаў Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ) найбольш важныя дакументы ўтрымліваюцца ў фондах сакратарыята Старшыні СНК У. І. Леніна (ф. 5) і Народнага камісара замежных спраў Г. В. Чычэрына (ф. 159), Польскага бюро агітацыі і прагандыры ЦК РКП (б). У іх змешчана перапіска з беларускім савецкім кіраўніцтвам, зводкі і даклады НК і ДПУ аб палітычнай сітуацыі ў краі, інструкцыі і рашэнні па асобных пытаннях дыпламатычных адносін. Прынцыповае значэнне для аналізу ўзаемаадносін РКП (б), НКЗС, сілавых ведамстваў і Камінтэрна маюць пратаколы пасяджэнняў Палітбюро ЦК РКП (б), уключаючы "асобыя папкі", куды заносіліся рашэнні па самым сакрэтным пытанням. Таксама прадстаўляюць цікавасць прамовы І.В. Сталіна, якія сабраў у 1930-я гг. І. П. Тоўстуха, большая іх частка не ўвайшла ў збор твораў 1940-х гг. (ф. 71). Яны дазваляюць прасачыць эвалюцыю яго поглядаў на нацыянальныя пытанні і яго рашэнні. Каштоўнасць маюць фільмакопіі дакументаў РДАСПГ з фонду сакратарыята У. І. Леніна, якія маюць міжнародны характар, а таксама матэрыялы пасяджэнняў Палітбюро ЦК УКП (б) па польскіх справах. Яны сведчаць аб негатыўным уплыве ўзаемных падазрэнняў на адносіны Масквы і Варшавы.

Фонды Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва (РДВА) ўтрымліваюць трафейныя польскія матэрыялы міжваеннага перыяду, з якіх былі выкарыстаны матэрыялы II аддзела польскага Генштаба (ф. 308), у прыватнасці зводкі і даклады мясцовых ваенных улад аб сітуацыі ў краі падчас польскай акупацыі, справаздачы разведкі, дэкларацыі, адозвы і брашуры, якія масава выпускаліся беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі як паланафільскага, так і антыпольскага складу. Яны дазваляюць даць ацэнку інфармацыйнаму кантэнту, якім аперыравала польскае кіраўніцтва пры прыняцці таго ці іншага рашэння па беларускім пытанні.

У фондах Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (ДАРФ) звяртаюць на сабе ўвагу матэрыялы УЦВК (Р-1235), СНК РСФСР (Р-130), Паўнамоцнае прадстаўніцтва ўрадаў РСФСР і УССР пры ўсіх замежных арганізацыях дапамогі Расіі (Р-1058), а таксама розныя архіўныя калекцыі (Р-6055 Калекцыя інфармацыйных матэрыялаў аб Савецкай Расіі, Германіі і іншых краінах за 1917–1937 гг.; Р-6218 – калекцыя матэрыялаў Беларускай Народнай Рэспублікі; Р-7067 – калекцыя матэрыялаў Лігі нацый). Пры дапамозе гэтых рэсурсаў удалося ўвесці ў навуковы зварот дыпламатычную перапіску НКЗС РСФСР з НКЗС БССР перыяду правядзення Генуэзскай, Гаагскай канферэнцый, Маскоўскай канферэнцыі па раззбраенні.

Фонды МЗС Польшчы (Ministerstwo Spraw Zagranicznych) (ф. 322) і пасольства Польшчы ў Лондане (ф. 503), Парыжы (ф. 463), Вашынгтоне (ф. 490), канцылярыі Ю. Пілсудскага (ф. 3), асабістыя фонды Л. Васілеўскага (ф. 390), Р. Кноля (ф. 1791), С. Каузіка (ф. 95), У. Грабскага (ф. 94), Э. Пілтца (ф. 391) у Archiwum aktów nowych, дазволілі больш дэталёва асвятліць спецыфіку савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду. Гэта align рознага кшталту стэнаграмы і пратаколы пасяджэнняў савецка-польскіх перагавораў, інструкцыі МЗС Польшчы, дыпламатычная перапіска, справаздачы, аналітычныя матэрыялы.

У фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) значную цікавасць для даследчыкаў савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду маюць матэрыялы фондаў 4п (ЦК КПБ (б)), 6 (ЦВК БССР), 7 (СНК БССР), 15 (Паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР у РСФСР), 34 (НКУС БССР), 39 (Цэнтрэвак), 40 (Белэвак), 71 (СНГ БССР), 126 (Упраўленне Упаўнаважанага УСНГ РСФСР пры СНК БССР), 325 (Рада Народных Міністраў БНР) і іншыя. Звяртаюць на сябе ўвагу перапіска паўнамоцнага прадстаўніка БССР у РСФСР М.І. Мароза з НКЗС БССР і НКЗС РСФСР, розныя статыстычныя матэрыялы, пратаколы пасяджэнняў, агляды польскамоўнай прэсы, перапіска Упраўлення ўпаўнаважанага НКЗГ РСФСР пры СНК БССР з Гандлёвым прадстаўніцтвам у Польшчы, НКЗГ РСФСР (СССР), перапіска кіраўніцтва Белэвак з членамі расійска-ўкраінскай дэлегацыі ў Змешанай камісіі па рэпатрыяцыі, Народным камісарыятам фінансаў БССР, Камітэтам па рээвакуацыі замежных прадпрыемстваў пры ВСНГ РСФСР.

Прызнаючы неабходнасць увядзення ў навуковы зварот архіўных дакументаў і матэрыялаў, неабходна звярнуць увагу на выніковасць звароту да апублікаваных раней крыніц, іх аналізу з сучасных поглядаў і падыходаў. Таму важную ролю ў даследаванні мелі шматлікія дакументальныя публікацыі, якія ўключаюць матэрыялы афіцыйнага справаводства. Для раскрыцця тэмы асноўнае значэнне адыгралі зборнікі "Дакументы знешняй палітыкі СССР" [1]. Першыя 17 тамоў выдання ўтрымліваюць шмат савецкіх і замежных дакументаў за 1917–1934 гг. Публікацыю істотна папоўнілі выданыя ІСБ АН СССР у супрацоўніцтве з гісторыкамі ПНР зборнікі дакументаў і матэрыялаў [2]. Дакументальныя матэрыялы, якія па-новаму раскрываюць многія сюжэты польска-савецкай вайны,

утрымлівае зборнік, падрыхтаваны пад кіраўніцтвам І. І. Касцюшка [5], і дакументы, выданыя польскія даследчыкамі і архівістамі [9]. Варта адзначыць грунтоўныя зборнікі дакументаў, падрыхтаваныя беларускімі спецыялістамі [3].

Для больш дэталёвага вывучэння міжнароднага становішча ў адзначаны адрэзак часу былі выкарыстаны інфармацыйны заявы, прамовы і публіцыстычныя працы вядомых дзяржаўных дзеячоў Савецкай дзяржавы і іншых краін, у прыватнасці, заявы і прамовы намесніка народнага камісара замежных спраў М. М. Літвінава [4], працы і выступленні народнага камісара замежных спраў СССР Г. В. Чычэрына [6], прамовы міністра замежных спраў Польшчы ў 1926–1932 гг. А. Залескага [11], разлічаныя на шырокую аудыторыю працы польскага міністра замежных спраў у 1932–1939 гг. Ю. Бэка [7], міністра замежных спраў Польшчы ў 1922–1923 і 1924–1926 гг. А. Скшыньскага [10] "Польшча і свет", польскага дзяржаўнага і палітычнага дзеяча У. Грабскага [8].

Значная частка крыніц па праблеме савецка-польскіх адносін 1921–1929 гг. апублікавана і ўведзена ў навуковае карыстанне. Аднак, на вялікі жаль, даследчыкі не маюць шырокага доступу да архіўных матэрыялаў шэрагу сховішчаў Расійскай Федэрацыі (напрыклад, Архіва знешняй палітыкі). Патрабуюць больш глыбокага вывучэння і публікацыі матэрыялы асабістага паходжання. Многія крыніцы (асабліва перыядычны друк) знаходзяцца на мяжы знішчэння, патрабуюць пераводу ў электронны выгляд. Накладвае адбітак спецыфіка дыпламатычных матэрыялаў, назіраецца частковае разыходжанне зместу афіцыйных дакументаў з неафіцыйнымі формамі ўзаемаадносін. Толькі комплексны аналіз крыніц дазволіць папоўніць факталагічную базу па праблеме. Да гэтага моманту невядомым застаецца месцазнаходжанне часткі пратаколаў пасяджэнняў Змешаных камісій, асабліва пагранічнай камісіі. Праведзены гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы аналіз паказвае, што фарміраванне цэласнай сістэмы савецка-польскіх адносін 1921–1929 гг. у савецкай і постсавецкай гістарыяграфіі сутыкалася з праблемамі недастатковай забяспечанасці архіўным матэрыялам, па прычыне яго сакрэтнасці і цяжкадаступнасці для даследчыкаў, да канца заставалася нявывучанай беларуская праблематыка на асобных этапах савецка-польскіх дыпламатычных зносін.


1. Документы внешней политики СССР : в 24 т. / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. – М., 1959.– Т. 3–12. – М., 1960–1967.
2. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т. / под ред. С. Вроньского. – М., 1964. – Т. 2 : декабрь 1918 г. – март 1920 г. – 528 с. ; Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т. / под ред. С. Вроньского. – М., 1965. – Т. 3 : апрель 1920 г. – март 1921 г. – 607 с.
3. Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў. – Т.1 : 1917–1922 гг. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – 395 с. ; Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4 т. – Мінск : Юніпак, 2008. – Т. 1 : 1 жніўня 1914–18 сакавіка 1921 гг. : у 2 ч. – Ч. 2 : 3 студзеня 1920–18 сакавіка 1921 гг. – 392 с.
4. Литвинов, М. М. Внешняя политика СССР, речи и заявления 1927–1935 гг. / М. М. Литвинов. – М., 1935. – 176 с.
5. Польско-советская война 1919–1920 (ранее не опубликованные документы и материалы) : в 2 ч. / И. И. Костюшко. – М. : ИСБ РАН, 1994. – Ч. 2 : 20 августа 1920 г. – 18 марта 1921 г. – 222 с. ; Польские военнопленные в РСФСР, БССР и УССР (1919–1922 годы) : документы и материалы / подг. публ. И. И. Костюшко. – М., 2004. – 404 с.
6. Чичерин, Г. В. Статьи и речи по вопросам международной политики / Г. В. Чичерин. – М., 1961. – 78 с.
7. Beck, J. Polska polityka zagraniczna w latach 1926–1939 / J. Beck. Paryz, 1990. 447 s.
8. Grabski, W. Dwa lata pracy u podstaw państwowości naszej (1924–1925) / W. Grabski. Warszawa, 1927. – 438 s.
9. Polacy na Białorusi od Powstania Styczniowego do XXI wieku. – T. 4 : Rok 1920 na tle przełomów politycynych XX wieku / pod red. T. Gawina. – Warszawa, 2020. – 783 s. ; Polacy na Białorusi od powstania Styczniowego do XXI wieku. – T. 5 : Traktat ryski i jego konsekwencje dla Polaków i Białorusinów. Monografia zbiorowa / pod red. T. Gawina. – Warszawa, 2021. – 732 s.
10. Skszyński, A. Polskaapokój / A. Skszyński. – Warszawa, 1923. 116 s.
11. Zaleski, A. Mowy ministra spraw zagranicznych p. Augusta Zaleskiego, wygloszone na posiedzeniu sejmowej komisji spraw zagranicznych w dniu 21-go lipca 1926 r. i w komisji senatu w dniu 22-go lipca 1926 r. / A. Zaleski. Warszawa, 1926. – 65 s.



**Михайлова Ю.Л.**


## «ЦИВИС – ОБЩИЙ ЛЮБИМЕЦ». КАРИКАТУРЫ СЕРГЕЯ ЦИВИНСКОГО КАК ОТРАЖЕНИЕ ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ ЖИЗНИ ЛАТВИЙСКОЙ РЕСПУБЛИКИ В 1920–1930-Е ГОДЫ

Известный художник-карикатурист межвоенного периода С.А. Цивинский родился в 1895 г. Даугавпилсе, в семье военного. Предполагалось, что он продолжит семейную традицию, пойдет по стопам отца. Цивинский получил фундаментальное военное образование: окончил псковский кадетский корпус, Александровское военное училище в 1914 г., Офицерскую воздухоплавательную школу в Гатчине в 1916 г., Одесскую школу высшего пилотажа в 1917 г. [12]. Однако талант художника изменил его жизнь: с 1920 г. Цивинский жил в Латвийской Республике, сотрудничая с рядом латвийских газет – «Сегодня», «Для Вас», «Rigasche Rundschau» («Рижское обозрение»), «Latvijas Sargs» («Защитник Латвии»), «Pēdējā Brīdī» («В последний момент»), журналом «Atpūta» («Отдых») и многими другими [16]. Информационное пространство межвоенной Латвии представляло широкий спектр политических мнений, который дополнялся также тем, что Латвийская Республика формировалась как государство многонациональное – крупнейшими предста-